# Творы Некрасава на беларускай мове

Дзяржаўнае выдавецтва БССР у перакладзе на беларускую мову выдала рад твораў Некрасава. У 1936 г. вышла ў свет кніга паэта «Дзед Мазай і зайцы» ў перакладзе А. Якімовіча, ілюстраваная мастаком В. Ціхановічам. Тыраж яе — 10 тысяч экземпляраў. Паўторнае выданне гэтай кнігі вышла ў 1938 г., таксама тыражом у 10 тыс. экз. У гэтым-жа годзе выдадзены асобнай кнігай верш «Сялянскія дзеці».

Тры разы выдаваўся «Генерал Тантыгін».

У перакладзе А. Якімовіча ў 1940 г. вышла ў свет паэма Н. Некрасава «Каму на Русі жыць добра» (тыраж 10 тыс. экз.). Другі раз гэтая паэма надрукавана ў 1948 г.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла ў 1936 г. у школьнай серыі «Выбраныя вершы» паэта на рускай мове, тыражом 15 тыс. экз.

Даваенныя выданні твораў Н. Некрасава сталі цяпер бібліяграфічнай рэдкасцю. Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна атрымала «Дзед Мазай і зайцы» і «Каму на Русі жыць добра» з Узбекістана. Цяпер гэтыя кнігі экспануюцца на выстаўцы, прысвечанай 75-годдзю з дня смерці Н. Некрасава, якая адкрылася ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна.